# Школьная планета

***НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!***

***№ 9 (47) ЛЕТА 2018***

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці*




## Гэта лета прайшло назаўсёды

Гэта лета прайшло назаўсёды,
Гэта лета ў сэрцы маім.
У небе хмары вядуць карагоды,
Навяваючы мне ўспамін.

Успамін пра былое каханне,
Успамін пра мінулыя дні.
Гэта нібы начное блуканне,
Праз імглу, дзе гарэлі агні.

Колькі момантаў зноў пераЖыта,
Сэрца б’ецца хутчэй у грудзях.
Колькі дзён назаўсёды забыта,
Попел часу застыў на вачах.

І жыццё прабягае няспынна,
Гэта лета ў сэрцы маім,
Яно будзе заўсёды гасцінна,
У душы саграваць успамін.

Мікіта Прыходзька

Дарагія чытачы, сёння нам хацелася б пагаварыць з вамі аб той цудоўный пары года, якую мы з нецярпеннем чакаем цэлы год – пра ***лета***. ***Лета*** – гэта нястрымнае сонца, гэта цяпло, гэта ***летні*** дождж, які прыносіць вясёлку. А пасля дожджыка ўсё жывое выглядае такім свежым і новым. Усе людзі, незалежна ад узросту, чакаюць наступлення ***лета***. Чаму яго з такім нецярпеннем чакаюць дзеці – зразумела. Тры месяцы канікул, бесклапотны час... Але чаму яго так чакаюць дарослыя? Можа быць, чаканне ***лета*** – гэта нешта з дзяцінства? Чаканне новых уражанняў, адпачынку, свабоды і бестурботнасці... Аб усім аб гэтым мы пагаворым у нашым нумары.

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 47, лета 2018 г.

# ВОСЬ ЯНО ЯКОЕ НАША ЛЕТА!!!

**Ззаду засталіся гарачыя летнія канікулы…**
**І зараз, напэўна, самы выдатны час, каб вучні і настаўнікі падзяліліся з намі ўспамінамі пра тое, якім было іх лета.**
**Мы прапанавалі некаторым з іх адказаць на наступныя пытанні:**
**1. Што такое лета?**
**2. Як вы праводзілі лета 2018 года?**
**3. Чым больш за ўсё запомніцца лета-2018?**



## Шамко Эдуард

1. Лета для мяне – гэта адпачынак, радасць, весялосць)))

2. Я працаваў летам… І гуляў з сябрамі)

3. Лета мне запомніцца новымі знаёмствамі, працай і вясёлымі момантамі з сябрамі))))))))))))))



## Сюмак Яна

1. Лета – гэта адпачынак , весялосць , шмат добрых эмоцый і ўспамінаў.

2. Выдатна.

3. Паездкамі на рэчку і вясёлым баўленнем часу з сябрамі.



## Аўсянская Яўгенія Мікалаеўна

1. Хтосьці вядомы казаў, што лета – гэта маленькае жыццё. Дык вось для мяне таксама лета – гэта маленькае жыццё.

2. Гэтае лета, як і звычайна, я праводжу ў ДОЛ "Папараць-кветка".

3. І гэтым летам я выпусціла свой першы клас)))

## Дарожка Юлія



1. Лета – гэта незабыўнае адчуванне, калі можаш адпачыць ад усяго і атрымаць асалоду пад гарачымі прамянямі сонца.

2. У лагеры, у паходах, з сябрамі на вуліцы, сям'ёй наведваем славутыя мясціны нашай краіны.

3. Сябрамі… Бо толькі з імі я магла адчуць сутнасць лета. З імі я была ў дрэннае надвор'е. З імі я была ўсюды. Я ім вельмі ўдзячная.

1. Што такое лета? 2. Як вы праводзілі лета 2018 года? 3. Чым больш за ўсё запомніцца лета-2018?

# ВОСЬ ЯНО ЯКОЕ НАША ЛЕТА!!!

## *Казачонак Лізавета*



1. Лета – гэта сонца, рэчка, весялосць. Падчас летніх канікул неабходна як мага больш ездзіць у паездкі, весела праводзіць час.

2. У чэрвені я працавала з аднакласнікамі, спачатку ў ЖКГ, а потым у будаўнічай брыгадзе. Потым паехала ў Мінск, гуляла там па крамах. Праз некаторы час яшчэ раз паехалі з Кацяй Аўтуховіч на атракцыёны. Вечарамі я хадзіла гуляць з сябрамі, а калі было дрэннае надвор'е, сядзела і чытала кнігі. Падцягвала біялогію, хімію.

3. Гэтае лета запомніцца мне вясёлымі днямі і вечарамі.

## *Аўтуховіч Кацярына*



1. Лета – гэта самая гарачая пара года. Гэта час канікул, час, калі можна проста адпачыць, схадзіць з сябрамі на рэчку, кудысьці паехаць, шпацыраваць да позняга, бо дні летам даўжэй. Лета – гэта новыя магчымасці, гэта шмат марожанага і гэта, калі пахне сонейкам.

2. Я не забывала пра вучобу. Старалася падцягваць тыя прадметы, якія мне патрэбныя для паступлення. Дома працавала над тэставымі заданнямі. Акрамя гэтага, хадзіла з сябрамі ў басейн, на рэчку, у піцэрыю, у кінатэатр. Чытала кнігі, але толькі тыя, якія мне падабаюцца. Увечары я гуляла.

3.Напэўна, больш за ўсё мне запомняцца вечары з маімі сябрамі. Яшчэ грашыма, якія я атрымала за працу ў школе і выдаткавала іх на паездку ў Мінск: у парк, на атракцыёны. Ездзілі з Лізай Казачонак, нам вельмі спадабалася.



## *Маркевіч Паліна*

1. Лета – гэта свабода, адпачынак ад школьнага жыцця.

2. Я праводзіла гэтае лета з сябрамі, бацькамі. Яшчэ ездзіла ў вёску да сваёй бабулі.

3. Гэтае лета запомніцца мне новымі сябрамі.

*Дом, у якім утульна ўсім!*
**berezino2.school.by vk.com/club59543714** *№ 47, лета 2018 г.*

# ВОСЬ ЯНО ЯКОЕ НАША ЛЕТА!!!

*1. Што такое лета? 2. Як вы праводзілі лета 2018 года? 3. Чым больш за ўсё запомніцца лета-2018?*

## *Аўтуховіч Наталля Уладзіміраўна*



Нідзе не была, нікуды не ездзіла. Лета – гэта доўгачаканы адпачынак, адпачынак ад школы. Праводзіла лета на градках дома або на дачы. Другую палову ліпеня сядзела на тэлефоне, тэлефанавала сваім дзецям, каб даведацца, хто куды паступіў. Запомніцца дзіўным надвор'ем: то лье дождж, то спякота такая, што з дому не выйсці. Чэрвень і палову ліпеня глядзелі з Кацяй Чэмпіянат свету па футболе. Гэта адно з самых яркіх уражанняў лета-2018.

## *Навумава Аляксандра*



1. Лета – гэта самы суперскі час, усе 90 дзён ты марыш правесці так, каб гэтае лета засталося ў памяці назаўжды. Сваё лета-2018 я праводзіла са сваімі сёстрамі і ў коле сваіх сяброў. Я старалася правесці гэтае лета так, каб не страціць ні хвіліны ў нудзе і ляноце. У мяне было шмат ідэй і часу для таго, каб правесці летнія дзянькі крута. Мы сустракалі світанне, адпачывалі на азёрах і рэках Беларусі.

2. Лета запомнілася мне сваім пераменлівым кліматам, які не заўсёды выратоўваў у складаных сітуацыях. Аднак прагулкі з сябрамі магчымыя ў любое надвор'е.

3. Калі зіма жартуе да красавіка, хачу каб лета помсціла да снежня, а летні настрой ва ўсіх доўжыўся да лета-2019.



## *Капанец Таццяна Ігараўна*

1. Лета – гэта адпачынак.

2. Працавала ў выдатным аздараўленчым лагеры імя Ю. Гагарына.

3. Дажджамі.

## *Бандзік Павел*



1. Для мяне лета – гэта адпачынак з сябрамі.

2. Я адпачываў з сябрамі, дапамагаў бацькам і праводзіў добра час.

3. Мне яно запомніцца тым, што я ездзіў у лагер, хадзіў на рэчку з сябрамі.



***Зелянкевіч Таццяна Мікалаеўна***

1. Лета – гэта ціхая радасць.
2. Адпачываю з асалодай.
3. Паездкай у Маскву.

# ВОСЬ ЯНО ЯКОЕ НАША ЛЕТА!!!

**Для школьнікаў пачатак летняй пары заўсёды асацыіруецца з канікуламі і незабыўным і такім жаданым адпачынкам, а для выпускнікоў лета – самая адказная пара. Як жа лепш правесці лета і набрацца новых сіл, і як удалей здаць іспыты?**

**Мабыць, гэтыя некалькі пытанняў для абітурыентаў-2018 былі самымі актуальнымі і самымі хвалюючымі.**

**Мы пагутарылі з нашымі выпускнікамі і вось што высветлілі…**

**1. Як вы праводзілі лета-2018, чым яно вам запомніцца больш за ўсё?**

**2. Куды вы паступілі?**

**3. З чым быў звязаны выбар навучальнай установы, чаго чакаеце ад вучобы?**

**4. Некалькі слоў-пажаданняў школе, настаўнікам і вучням!!!**

***Вайцяховіч Лізавета***




1. Гэтае лета напоўнена вельмі яркімі момантамі. Я з'ездзіла ў цудоўны горад Брэст, адзін з маіх любімых гарадоў. Пабывала на моры)))) адпачыла перад доўгай, цяжкай вучобай.

2. Я паступіла ў БДУІР.

3. Мой выбар быў заснаваны на прадметах, якія мне падабаліся ў школе, цягай да праграмавання і прэстыжнасцю ІТ-тэхналогій у цяперашні час. У гэтым годзе я чакаю шмат новых і яркіх эмоцый, выдатных сяброў і, вядома ж, удалай вучобы)

4. Хачу, каб школа квітнела. Каб, як і раней, дзеці былі рады вучыцца ў такой выдатнай школе, з такімі выдатнымі настаўнікамі. Настаўнікам – цярпення, мудрасці. А вучням – пабольш прыемных момантаў, добрых адзнак.

# ВОСЬ ЯНО ЯКОЕ НАША ЛЕТА!!!

**1. Як вы праводзілі лета-2018, чым яно вам запомніцца больш за ўсё? 2. Куды вы паступілі? 3. З чым быў звязаны выбар навучальнай установы, чаго чакаеце ад вучобы? 4. Некалькі слоў-пажаданняў школе, настаўнікам і вучням!!!**

## *Дудко Аляксандра*

1. Ну, магу сказаць, што гэта лета – адно з самых насычаных. Такая велізарная колькасць падзей і за такі маленькі прамежак часу (асабліва з улікам таго, што звычайна летам мы проста дурэем).



Так як я выпускніца, галоўнымі маімі заняткамі былі падрыхтоўка да іспытаў, ЦТ, ну і непасрэдна іх здача. Калі ж гэта ўсё скончылася, думалася: "Фух, ну нарэшце. Не верыцца, што гэты этап пройдзены і можна са спакойнай душой адпачываць". Але не тут было, цяпер на парадку дня было пытанне аб выбары ВНУ і спецыяльнасці. Нерваў, вядома, сышло нямала. І ў мяне, і ў маіх бацькоў. Але нягледзячы на ўсе цяжкасці, у выніку ўсё вырашылася добра і толькі пасля таго, як я ўбачыла сваё імя ў спісе залічаных, маё лета па-сапраўднаму пачалося)

Больш за ўсё мне гэтае лета запомнілася ўсімі выпрабаваннямі, якія чакаюць кожнага абітурыента і … тымі днямі, якія я праводзіла са сваімі школьнымі сябрамі!

2. Я паступіла ў БНТУ на факультэт энергетычнага будаўніцтва.

3. Мы з бацькамі доўга выбіралі факультэт, на які паступаць, але ў выніку прыйшлі да факультэту энергетычнага будаўніцтва. Мы прынялі такое рашэнне, таму што выпускнік гэтага факультэта зможа знайсці працу ў любым населеным пункце, няхай гэта будзе вёска, няхай гэта будзе вялікі горад. Энергетыка – гэта галіна прамысловасці, якая развіваецца, і я лічу, што гэта даволі перспектыўны накірунак.

На самай справе, ад вучобы чакаю цяжкасцяў, але спадзяюся, што мне будзе цікава вывучаць тое, што мне неабходна будзе ведаць.

4. Хачу ў пачатку сказаць вялікі дзякуй маёй школе і маім настаўнікам. Для мяне школа была другім домам з-за той атмасферы, якую стваралі вучні і настаўнікі. Хачу пажадаць, каб школа была для ўсіх месцам, дзе і цікава атрымліваць новыя веды і прыемна праводзіць пазавучэбны час. Прызнаюся, што моцна буду сумаваць па некаторых настаўніках і хачу пажадаць ім больш пазітыву, цярпення і вельмі добрага настрою, каб у дні, калі па 6-8 урокаў, яны ўсё роўна выходзілі са школы з усмешкай на твары)

# ВОСЬ ЯНО ЯКОЕ НАША ЛЕТА!!!

**1. Як вы праводзілі лета-2018, чым яно вам запомніцца больш за ўсё? 2. Куды вы паступілі? 3. З чым быў звязаны выбар навучальнай установы, чаго чакаеце ад вучобы? 4. Некалькі слоў-пажаданняў школе, настаўнікам і вучням!!!**

## *Пракаповіч Аліна*



1. Першы месяц лета я здавала экзамены і рыхтавалася да ЦТ. Потым я падавала дакументы ў ВНУ. А пасля я проста адпачывала, хадзіла гуляць, глядзела фільмы, чытала кнігі. Лета мне запомніцца тым, што гэта апошнія, можна сказаць, школьныя канікулы, тым, што я паступіла.

2. БДУІР.

3. Выбар установы быў звязаны з маім профілем у школе (фізіка-матэматычны) і тым, што я марыла атрымаць тэхнічную спецыяльнасць. Чакаю новых ведаў, прыемных знаёмстваў, новых перамог.

4. Школе – добрых вучняў, настаўнікам – цярпення, а вучням – паспяховай вучобы.

## *Кляшчонак Дзмітрый*



1. Па класіцы жанру, сядзеў каля камп’ютара, дапамагаў па хаце, хадзіў на рэчку, спрабаваў зрабіць што-небудзь цікавае. Запомніцца выпускным і падрыхтоўкай да яго, а так проста лета.

2. БДТУ.

3. Звязаны з інжынернай спецыяльнасцю. Хацелася паступіць на спецыяльнасць, якая цікавіць мяне, але рызыкаваць не стаў, балы там былі высокія. Чакаю складанай вучобы і большай самастойнасці.

4. Жадаю вучням ўсебакова развівацца па-за сценамі школы, чытаць, маляваць і г.д., гэта вельмі дапаможа ў вучобе, настаўнікам жа часам адыходзіць ад школьнай праграмы і распавядаць пра цікавыя бакі свайго прадмета.

# Вось яно якое наша лета!!!

1. Як вы праводзілі лета-2018, чым яно вам запомніцца больш за ўсё? 2. Куды вы паступілі? 3. З чым быў звязаны выбар навучальнай установы, чаго чакаеце ад вучобы? 4. Некалькі слоў-пажаданняў школе, настаўнікам і вучням!!!

## *Сімончык Вікторыя*



1. Ну, натуральна, не сыдзе з маёй памяці сам працэс здачы ЦТ, падача дакументаў, паступленне, усе гэтыя нервы дакладна не забудуцца). У асноўным гэта ўсё і заняло большую частку майго лета. Пасля я магла смела адпачываць і займацца сваімі справамі. У асноўным, маё лета праходзіла, як і ў самага звычайнага чалавека:) я спрабавала высыпацца, таму што ведала, што калі пачнецца вучоба, то ў мяне не будзе хапаць часу на сон). Старалася дапамагаць бацькам, сядзела са сваёй малодшай сястрой, хадзіла гуляць, чытала мастацкую літаратуру, ну і вядома не забывала пра біялогію :). З сястрой ездзілі ў вёску да бабулі, там праводзілі трохі часу і назад у Беразіно:)

2. Я паступіла ў Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт.

3. На працягу ўсёй вучобы доўгі час задумвалася пра гэта. Не ведала, што здаваць і кім быць да 10-га класа. Калі скончыўся 9-ы, трэба было выбіраць, куды рухацца далей. І я выразна для сябе вырашыла, што пайду ў профіль хіміі і біялогіі. Спачатку было складана, але потым я прывыкла і вучоба мне падабалася) менавіта за гэтыя 2 гады я вельмі палюбіла біялогію і хімію. Мне вельмі падабаліся нашы выкладчыкі і я разумела, што з профілем я не пралічылася)) Для сябе вырашыла, што буду старацца паступаць у медыцынскі, таму што гэта маё. Бацькі цалкам падтрымлівалі мой выбар. Я выдатна для сябе разумела, што буду спрабаваць паступаць у Віцебск і цяпер я пра гэта ні кроплі не шкадую. Так, вучоба будзе, безумоўна, складанай, але я разумела, куды я іду. Пасля таго, як даведалася, што паступіла на бюджэт, то ўзровень маго шчасця зашкаліваў. Спадзяюся, што ўсё будзе добра))

4. Безумоўна, хачу выказаць вялікі дзякуй школе і настаўнікам. Асабліва ўдзячна Міхалёвай Надзеі Сяргееўне, Тыцюк Святлане Аляксандраўне, Кошману Івану Цімафеевічу. Дзякуючы гэтым настаўнікам я наблізілася да сваёй мары. Хачу пажадаць усім настаўнікам пабольш сіл, цярпення, моцнага здароўя і веры ў сваіх вучняў.

Цяпер, прайшоўшы ўвесь гэты шлях, хачу проста сказаць вучням, каб яны, вядома ж, стараліся, цалкам давяралі настаўнікам, верылі ў сябе, ну і паступалі туды, куды кліча сэрца.

# ВОСЬ ЯНО ЯКОЕ НАША ЛЕТА!!!

**1. Як вы праводзілі лета-2018, чым яно вам запомніцца больш за ўсё? 2. Куды вы паступілі? 3. З чым быў звязаны выбар навучальнай установы, чаго чакаеце ад вучобы? 4. Некалькі слоў-пажаданняў школе, настаўнікам і вучням!!!**

## *Шмарлоўскі Ілья*



1. Лета праходзіла добра, запомнілася тым, што мы ,11-я класы, больш з'ядналіся. Запомнілася гэтымі хвалюючымі днямі чакання перад паступленнем.

2.Паступіў я ў БРУ.

3.Выбар быў заснаваны з баламі па ЦТ. Чакаю таго, што будзе шмат новых знаёмстваў і сяброў.

4. Школа няхай застаецца такой, якой яна запомнілася мне. Настаўнікам хачу пажадаць пабольш цярпення (з намі проста не бывае). Вучні хай не лянуюцца, хай надаюць максімум намаганняў для таго, каб у будучыні прыйсці да сваёй мэты.

## *Жук Вольга*

1. Палову свайго лета я правяла за падрыхтоўкай да ЦТ, здачай экзаменаў. На астатнюю палову засталося мала часу, і я яго праводзіла стандартна: прагулкі з сябрамі, рэчка, дапамога маме. На пару тыдняў адлучылася ў Нясвіж да сваёй сястры. Там я стала хроснай мамай.

2. Я паступіла ў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт (БДТУ) на факультэт хімічнай тэхналогіі і тэхнікі.

3. Выбар навучальнай установы быў звязаны з баламі (сюды цалкам магчыма паступіць і з невысокімі баламі), тут кожнаму першакурсніку даюць інтэрнат, што вельмі важна. Вельмі спадабаўся сам універсітэт, метады падыходу выкладчыкаў да студэнтаў, да іх працаўладкавання. Наконт вучобы, я рыхтуюся да цяжкасцяў, ведаю, што будзе нялёгка, але спадзяюся, што я хутка ўцягнуся ў гэты працэс. Вядома ж, не сумняваюся, што будзе вельмі вясёлая студэнцкае жыццё.



4. Вельмі хочацца сказаць словы падзякі нашым выдатным настаўнікам, якія аддавалі часцінку сваёй душы, каб навучыць нас новаму. Нават гэтыя словы не могуць перадаць усяго таго, як я рада, што мама мяне прывяла менавіта ў сярэднюю школу №2! Захапляюся нашым педкалектывам! І хачу пажадаць моцнага здароўя! Добразычлівых і ўседлівых вучняў, цярпення і сіл працаваць далей і атрымліваць задавальненне ад сваёй працы! Буду вельмі сумаваць!!!

# ВОСЬ ЯНО ЯКОЕ НАША ЛЕТА!!!

**1. Як вы праводзілі лета-2018, чым яно вам запомніцца больш за ўсё? 2. Куды вы паступілі? 3. З чым быў звязаны выбар навучальнай установы, чаго чакаеце ад вучобы? 4. Некалькі слоў-пажаданняў школе, настаўнікам і вучням!!!**



## *Аўтухова Яна*

1. На жаль, але як і ва ўсіх выпускнікоў, лета пачалося з мандражу. Страх перад экзаменамі, ЦТ, паступленнем. Усё ў стане стрэсу. Нервы нацягнутыя да мяжы. Але падрыхтоўка да выпускнога і пачатку дарослага жыцця ставіла мяне на месца. Пасля, калі ўжо ўсё скончылася, быў час на ўсе мае любімыя заняткі. Я захлынулася ў кнігах, актыўна займалася танцамі, адкрывала для сябе ўсё тыя ж пейзажы нашага Беразіно, але пад новымі ракурсамі са сваім кампаньёнам роварам. Спрабавала правесці гэтае лета на ўсю катушку, як не магла раней, як калісьці не паспела.

2. Я паступіла ў ВГАВМ ("Віцебская ордэна" Знак Пашаны" дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны").

3.Гэта была мара з дзяцінства. Вельмі люблю жывёл і сваю будучыню я вырашыла звязаць менавіта з імі.

4. Жудасна будзе не хапаць нашай школы. Буду сумаваць па калідорах, у якіх носіцца няўрымслівая малышня, і па класах, дзе падчас урока павінна быць цішыня і поўная ўвага на настаўніка, але так хочацца заняцца сваімі важнымі справамі і пагутарыць з аднакласнікамі менавіта падчас гэтага ўрока. Я так буду сумаваць па гэтай вялікай сям'і! Дарагая школа, жадаю табе заставацца такой жа радаснай і роднай, такой жа гасціннай і поўнай ведамі. Я веру, што мы пакінулі школу на надзейныя плечы тваіх вучняў. А вучням жадаю поспехаў і адкрыццяў у гэтым поўным ведамі свеце пад назвай Школа.

## *Сарока Андрэй*

1. Першы месяц лета займаўся паступленнем. Другі – адпачываў. Трэці – працаваў.

2. Паступіў у БНТУ.

3. З выбарам мне дапамаглі добрыя людзі. Ад вучобы чакаю новых знаёмстваў з цікавымі людзьмі.

4. Вучням пажадаю, каб ўзяліся за розум (пакуль не позна).А настаўнікам цярпення.



# ВОСЬ ЯНО ЯКОЕ НАША ЛЕТА!!!



## *Ермакова Анастасія*

1. Цалкам нядрэнна, запомніцца, напэўна, праведзеным часам разам са сваімі блізкімі сябрамі.

2. ВДУ ім.Машэрава.

4. Добрага дня… і каб не забывалі нас

## *Маркевіч Ірына*



1. Пасля экзаменаў пайшла на працу і 2 месяцы працавала, а ў вольны час гуляла з сябрамі. Запомнілася паступленнем.

2. У ветэрынарную акадэмію.

3. Ад вучобы чакаю таго, што ў выніку буду добрым спецыялістам.

4. Школе жадаю, каб заставалася такой жа хатняй і ўтульнай, настаўнікам цярпення, вучням лёгкай вучобы)




***Дарэчы, у гэтым нумары слова “ЛЕТА” і вытворныя ад яго ўжываецца 101 раз! Не верыце??? Праверце!)))))***

# ДА СУСТРЭЧЫ, ЛЕТА...

# ДА СУСТРЭЧЫ!!!

ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына, Сямашка Паліна, Маркоўская Лізавета, Усачова Валерыя